# М.А. ЦЫТОВІЧ (1900–1984): 115 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Геолаг, заснавальнік вучэння аб механіцы мёрзлых грунтоў Мікалай Аляксандравіч Цытовіч нарадзіўся 26 мая 1900 г. у в. Бель – 1 Крычаўскага раёна. Скончыў Ленінградскі інстытут грамадзянскіх інжынераў (1927).

Працаваў выкладчыкам геалогіі ў Ленінградзе (1927–1943), навуковым супрацоўнікам Інстытута мерзлотазнаўства СА АН СССР (1948–1952 – нам. дырэктара). Прафесар Цытовіч асноўную ўвагу ўдзяляў пытанням механікі грунтоў і інжынернай геалогіі. Ён сфармуляваў асноўныя прынцыпы будаўніцтва ў зоне шматгадовай мерзлаты, праводзіў назіранні над інжынерна-геалагічнымі працэсамі, даследаваў устойлівасць падмуркаў розных збудаванняў; распрацаваў метады вызначэння фізіка-механічных і геалагічных уласцівасцей грунтоў. Цытовіч прымаў удзел пры выбары пляцовак для Куйбышаўскай, Ангарскай і Вілюйскай ГЭС. Член-карэспандэнта АН СССР (1943) М.А. Цытовіч у 1947–1952 гг. узначальваў Якуцкі філіял СА АН СССР, а з 1952 – працаваў прафесарам Маскоўскага інжынерна-будаўнічага інстытута. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1950). Мікалай Аляксандравіч – Ганаровы прэзідэнт Нацыянальнага камітэта СССР Міжнароднага таварыства механікі грунтоў. За ўклад у развіццё айчыннай геалогіі М.А. Цытовіч узнагароджаны трыма ордэнамі, удастоены звання Герой Сацыялістычнай працы (1980).

*І.М. Шаруха*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова